ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 135 (517) Субота, 3 сьнежня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвона Зьмена": Менск, Комсам. 25.

15-му ЗЬЕЗДУ ЎСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ—ЛЕНІНСКАЙ КАГОРЦЕ БАЛЬШАВІКОЎ, ВЯДУЧАЙ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН ДА СОЦЫЯЛІЗМУ,—ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ АД БЕЛАРУСКАГА КОМСАМОЛУ!

15-ты партзьезд.

Другога сьнежня адчыніўся 15-ты зьезд Комуністычнай партыі.

Усе партыйныя організацыі нашай краіны актыўна рыхтаваліся да зьезду і шырока былі абгавораны найбольш важныя пытаньні палітыкі партыі, тэзісы ЦК і контр-тэзісы троцкістых.

95,5 процантаў усіх сяброў партыі, як адзін чалавек, адзначылі, што асноўным вынікам партыйнай політыкі зьяўляецца замацаваньне позіцый соцыялізму ў краіне, значная перавага соцыялістычных элемэнтаў над капіталістычнымі, новыя магчымасьці, якія адчыняюцца перад савецкай уладай у справе наступленьня на капіталістычныя элемэнты.

У часе дыскусіі выявілася, што опозіцыя ў сваёй барацьбе дайшла да такой мяжы, за якою пачынаецца шлях контррэволюцыі, шлях другога інтэрнацыяналу.

Троцкісты разьбіты на голаву. 705 тысяч бальшавікоў за цэнтральны камітэт і толькі 3.900 чалавек за дробна-буржуазную опозіцыю. У той-жа час 63 тысячы рабочых падало заявы аб уступленьні ў шэрагі ленінскай партыі.

Опозіцыя атрымала ад партыі рашучы адпор. Якія-б, у будучым, ня былі ў нашай краіне цяжкасьці,—опозіцыя ніколі не атрымае магчымасьці ажыцьцявіць троцкісцкую лінію, падмяніць ленінізм троцкізмам.

Справа цяпер за самой опозіцыяй. Альбо опозіцыя чэсна прызнае свае памылкі і зьвернецца на ленінскі шлях, зрабіўшы заявы аб поўным выкананьні пастанву 15-га зьезду УсеКП(б), альбо опозіцыя сваіх памылак нб прызнае і гэтым самым паставіць сабе па-за шэрагамі партыі.

Бальшавіцкая-ж партыя, як і заўсёды, пойдзе ленінскім шляхам.

Гарачае комсамольскае прывітаньне 15-му Усесаюзнаму зьезду комуністычнай партыі!

Комсамол за ленінізм!

Абгаварэньне пытаньняў 15-га зьезду УсеКП ў Менскай організацыі комсамолу падыходзіць к канцу. Ужо цяпер асноўныя вынікі могуць быць падведзены з беспамылковасьцю, каб сказаць, за каго быў голас мас комсамолу: за партыю, за ленінізм, ці за кучку фракцыянэраў—раскольнікаў, за троцкізм-нэоменшавізм. Больш двух тыдняў комсамольская маса выключна была занята абгавараньнем тэзісаў ЦК УсеКП(б), усебаковым вывучэньнем сутнасьці рознагалосьсяў. Сход Менскага актыву амаль аднагалосна (з 600 прысутных—6 галасоў за опозіцыю і 9 устрымаўшыхся), адобрыў лінію і рашэньні партыі, па сутнасьці азначала сабою вынік абгаварэньня гэтых пытаньняў у комсамольскай організацыі.

Па Ляхаўскім раёне з 1062 членаў і кандыдатаў, прысутнічаўшых на сходах ячэек, абгаварваўшых тэзісы аб пяцігадовым пляне галасавала за тэзісы ЦК УсеКП(б)—1026 чалавек, ці 96,6 проц., супроць 2-х ці 0,2 проц., устрымалася 26 ці 2,6 проц., не галасавала 6 ці 0,6 проц.

Па гарадзкім раёне з 2618 чалавек прысутнічаўшых на сходах галасавала за тэзісы ЦК УсеКП(б)—2467 чалавек, ці 94,3 проц., супроць 14, ці 0,5 проц., устрымалася 97 ці 3,7 проц., не галасавала 40 ці 1,5 проц.

Па Кастрычнікаўскім раёне з 590 прысутных галасавала за тэзісы ЦК УсеКП(б)—560 ці 94,9 проц. супроць 2 ці 0,3 проц., устрымалася 28 ці 4,8 проц.

Асноўныя рабочыя ячэйкі: цяга, МШВ МББ, гута „Пролетары", „Энэргія", Заходняй чыгункі, „Мэталь", сельска-гаспадарчыя майстэрні—прагаласавалі аднагалосна пры 1-2 устрымаўшыхся (1-2 ячэйкі). Буйныя вучэбныя ячэйкі, як БДВ—з 554 сяброў і кандыдатаў супроць галасаваў адзін і ўстрымалася 11 (з іх ужо некалькі чалавек далучыліся да тэзісаў ЦК). Гэтыя сухія лічбы гавораць самі за сябе. Пытаньні 15 га зьезду на сходах ячэек праходзілі не адным галасаваньнем, а жывейшым абгаварваньнем іх радавымі членамі комсамолу. Так па ляхаўскім раёне з 1.062 прысутных выказалася 189 т. т. ці 17,8 проц. усіх прысутных. У рабочых ячэйках гэты процант падымаецца да 22,6 проц. Гэтыя лічбы характэрныя і для Кастрычнікаўскага і Гарадзкога раёну. Па адным Кастрычнікаўскім раёне на сходах ячэек было задача 427 пытаньняў, такі-ж малюнак па Ляхаўскім і Гарадзкім раёнам. Пытаньн 15-зьезду, як ніякія іншыя, прыцягнулі ўвагу самай шырокай масы комсамольцаў, радавых рабочых т. т. актыўнае, дзелавое абгаварваньне якіх падрыхтаваныя выступленьні з матар'яламі, лічбамі, сьведчыць сабою аб вялізарным ідэйна-палітычным, ленінскім росьце шэрагаў нашай організацыі. Гэта дзелавое таварыскае абгаварваньне пытаньняў у некаторых ячэйках (Меншвей) стараліся сарваць дэмагогічнымі, яўна хлусьлівымі, часам контррэволюцыйнымі выступленьнямі адзіночкі-опозіцыянэры. Так, у адной ячэйцы выступіўшы опозіцыянэр гаварыў аб усім, толькі не па сутнасьці і дагаварыўся да таго, што сказаў: „Рукі Сталіна абліты крывёю кітайскіх рабочых". Ячэйка ўхваліла гэтага опозіцыянэра, за спробы зрыву дзелавога абгаварваньня пытаньняў, контр-рэволюцыйную заяву—выключыць з організацыі. Шэраг ячэек, заслухваўшых інформацыю аб выключэньнях акругкомам опозіцыянэраў, вядучых фракцыйную працу, адзінадушна адобрылі выключэньні. Дзелавое, практычнае абгаварваньне пытаньняў, з рашучым адпорам хлусьлівым заявам зарваўшыхся опозіцыянэраў, адзінадушная падтрымка партыі, поўная згода з яе рашэньнямі адносна фракцыянэраў—раскольнікаў, з тэзісамі да 15-га зьезду—такі характар адбываючыхся сходаў.

Важна адзначыць, што ў некаторых ячэйках (абойная фабрыка) опозіцыянэры-комсамольцы прапанавалі зьняць з абгаварваньня сходамі тэзісы ЦК УсеКП(б) па тых мотывах што, бач, трэба раней прапрацаваць у гуртках, добра вывучыць, і толькі потым ставіць на сходах. Гэта прапанова па сутнасьці не магла нічога другога азначаць, як жаданьне адцягнуць абгаварваньне пытаньняў да пачатку 15-га зьезду, а потым, калі пачнецца зьезд ня можа быць і гутаркі аб абгаварваньні гэтых пытаньняў і, такім чынам, пакінуць комсамольскую організацыю ў палажэньні не сказаўшай свайго слова па пытаньнях, якія будзе вырашаць 15 зьезд. Сход ячэйкі гэту прапанову адхіліў і сваёй перважнай большасьцю галасаваў за тэзісы ЦК УсеКП.

Такім чынам, гэта нікчэмная спроба адзінкі-апозіцыянэра атрымала адпор, чым дακазала, што комсамольская організацыя разумее, дзе ленінізмам пранізаны прапановы і дзе яны пранізаны троцкізмам-нэоменшавізмам.

З тэй прычыны, што тэзісы ЦК УсеКП(б) пранізаны ленінізмам, дык і атрымалі адабрэньне самай шырокай масы комсамольцаў, адабрэньне выключэньня з партыі фракцыянэраў раскольнікаў, і такім-жа адказам на опозіцыйныя паклёпы на партыю зьяўляецца падача заяў аб уступленьні ў партыю больш 100 членаў комсамолу, радавых рабочых.

Абгаварэньне выявіла і іншыя моманты жыцьця комсамольскай організацыі, але аб іх у другі раз. Адно ясна, галоўнае і асноўнае—комсамольская організацыя Менск да 15-га зьезду партыі прышла адзіннай, згуртаванай вакол партыі, яе сьцягу.

А. Красоўскі.

Мы—за лінію партыі, за ленінскі ЦК!

Комсамолу не па шляху з опозіцыяй.

(Віцебск)

Разбор пытаньняў партыйнай дыскусіі, які праводзіцца цяпер у комсамольскіх ячэйках, яшчэ ня ўсюды скончыўся. Па вестках, паступіўшых на 28 лістапада, матар'ялы аб рабоце ў вёсцы абгаварваліся **ў 15 рабочых ячэйках,** дзе выступіла ў спрэчках 30 чалавек. Опозіцыйных выступленьняў ня было; пры галасаваньні рэзолюцыі **на 269, галасаваўшых за лінію ЦК, было 5 устрымаўшыхся.**

У 5 ВУЗ'аўскіх комсамольскіх ячэйках выступіла ў спрэчках 45 чалавек. Выступаўшых за опозіцыю ня было. Галасаваньне дало **пры 171 чал. за лінію ЦК, 12 устрымаўшыхся.**

У 2 савецкіх ячэйках выступіла ў спрэчках 11 чал. **Галасавала за лінію ЦК 65 чалавек,** пры адсутнічаньні галасаваўшых супроць і ўстрымаўшыхся. У адной школьнай ячэйцы галасавала **за рэзолюцыю 30 чал., пры 5 устрымаўшыхся.**

Абгаварваньне матар'ялаў аб пяцігадовым пляне народнае гаспадаркі адбылося **ў 11 рабочых ячэйках,** дзе выступілі ў спрэчках 10 чал. Пры галасаваньні **ўстрымаліся 3 чал.** і астатнія **175 чалавек галасавалі за лінію ЦК**

У 4 ВУЗ'аўскіх ячэйках было адно опозіцыйнае выступленьне. **За лінію ЦК галасавалі 239 чалавек, за опозіцыю 2 чал. і ўстрымаўшыхся было 3 чал.**

У 5 савецкіх ячэйках, дзе выступілі ў спрэчках 16 чал., опозіцыйных выступленьняў ня было. **За рэзолюцыю галасавалі ўсе 149 прысутнічаўшых на сходах.**

Прыведзеныя вышэй лічбы вынікаў абгаварэньня матар'ялаў дыскусіі ў комсамольскіх ячэйках яшчэ раз гавораць аб тым, што опозіцыя не знайшла сабе месца ў комсамоле. Ленінскі комсамол ідзе за ленінскім ЦК комуністычнае партыі.

Г.



Рапорт узброенага комсамолу.

21-га лістапада сход комсамольскага актыву 5-га стралковага корпусу заслухаў даклад „аб 5-цігадовым пляне народнай гаспадаркі і аб працы ў вёсцы". На сходзе прысутнічала 525 чалавек. У спрэчках выступіла 10, запісалася 21. У ліку выступаючых у спрэчках—адзін опозіцыянэр, прыбыўшы з папаўненьнем 1905-га году нараджэньня.

Вось наша рэзолюцыя:

„Комсамольскі актыў 5-га стралковага корпусу цалкам і безагаворачна адобрывае тэзісы Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б).

Актыў комсамолу 5-га стралковага корпусу, ў ліку звыш 500 чалавек, заклікае ўсю комсамольскую організацыю корпусу згуртавацца вакол партыі, даць адзінадушны і рашучы адпор фракцыянэрам і раскольнікам.

Сход комсамольскага актыву лічыць, што ў шэрагах корпуснай комсамольскай організацыі няма месца ніводнаму опозіцыянэру".

„Няхай жыве адзіная ленінская спаяная компартыя! Няхай жыве ленінскі комсамол.

За рэзолюцыю галасавала 524 чалавек, супроць—1.

Аднагалосна!

(Слуцак)

Уважліва слухамі профшкольцы даклад аб пяцігодцы. Былі перад сходам у нас незразумелыя пытаньні, але дакладчык добра растлумачыў кожнаму яго непаразуменьні.

Агульны сход профшкольскай комсамольскай ячэйкі аднагалосна далучыўся да пастановы сходу гарадзкога актыву комсамола, адобрываючага тэзісы ЦК УсеКП.

У. Багдановіч.

Палітычныя „беднякі"

(Ячэйка ЛКСМБ першай друкарні).

На працягу ўсяго дакладу т. Дунца з боку ячэйковых „гора-опозіцыянэраў" ня сьціхаюць рэплікі.

Але вось даклад скончаны. Пасыпаліся пытаньні. Гэтыя «опозіцыянэры» выступаючы ў спрэчках даказалі на сходзе свае паўнейшае незнаёмства з вёскай. Адзін з іх нават задаў такое пытаньне:

— Якую карысьць дае сялянству мэліорацыя?

Хлапцы падняли яго на сьмех.

Па дакладу выступіла 8 чалавек, характэрным было выступленьне комсамольца Мэйстэра. Спачатку ён гаварыў наогул і ў прыватнасьці аб опозіцыі. Сходу абрыдзела яго слухаць. Была прынята прапанова аб тым, каб Мэйстэру далі слова толькі па сутнасьці пытаньня. Мэйстэр прадаўжаў далей. Гаварыў ён паўтары гадзіны і адно толькі было чутна ў яго прамове: ўсюды ў нас кепска, расьце кулак, становішча беднаты пагаршаецца.

Другі комсамолец Цытвер узяўся «выправіць памылкі» Бухарына.

— Ага—заяўляе ён з агідай: зараз Бухарын адмовіўся ад сваіх памылак.

— Якіх?—пытае сход.

— «Абагашчайцеся».

—«Абагашчайце» свой „галаўны" багаж, дарагія таварышы, а то вы зьяўляецеся палітычнымі „беднякамі"—такі метка выразіўся ў сваім выступленьні тав. Рамізевіч.

Рэзолюцыя, адабраючага тэзісы ЦК, была прынята 16 галасамі пры 5 супроць і 4 устрымаўшыхся.

М. Газэтны.



У партыю, у комсамол!

▣ У гарадзкіх раёнах Віцебску і адным вясковым падана 112 заяў ад рабочых-комсамольцаў і ад аднаго батрака аб уступленьні ў партыю. Аб уступленьні ў комсамол паступіла 91 заява ад рабочых і 7 ад батракоў.

Цяга ў ленінскія шэрагі партыі і комсамолу з боку працоўнай моладзі—лепшы адказ опозіцыі.

▣ 315 заяў падала рабочая моладзь Бабруйску ў ленінскі комсамол. 94 рабочых-комсамольцаў падалі заявы аб уступленьні ў шэрагі комуністычнай партыі.

▣ У сувязі з Кастрычнікавым заклікам у Полацку падана заяў аб прыёме ў КП(б)Б—ад 37 рабочых-комсамольца і ад рабочай моладзі аб прыёме ўЛКСМБ—43 заявы. Па ячэйках заявы разьмяркоўваюцца наступным парадкам:

У ячэйцы паравога млыну падалі заявы ў партыю 4 чалавекі, у комсамол—4.

У ячэйцы «ваеннага гарадку» у партыю—3 і ў комсамол—3.

У скурнікаў: у партыю—5, у КСМ—4. У краўцоў: у партыю—3, у КСМ—3. У дрэваапрацоўнікаў: у партыю—6, у КСМ—10. У мэталістых: у партыю—2, у КСМ—6. У будаўнікоў: у партыю—4, у КСМ—1. У чыгуначнікаў: у партыю—7. У фабзавучнікаў: у партыю—1, у КСМ—10. У харчэўнікаў і друкароў у партыю падалі заявы па 1 чалавеку.

Савецкія ячэйкі—атрымалі заяву у КСМ ад 2-х чалавек.

Справы і людзі опозіцыі.

Усе, хто цягнецца ў хвасьце комуністычнага саюзу, стаяць цяпер у пярэдняй калёне, на правым флянгу комсамольскай опозіцыі.

Самыя адсталыя пласты комсамольцаў зьяўляюцца самымі перадавымі опозіцыянэрамі.

Уласна кажучы, аб комсамольскай опозіцыі гаварыць ня прыходзіцца. Усё-ж цікава паглядзець, чым жыве комсамольская опозіцыя.

Пакрыўджаныя і закінутыя.

Заўсёды і ўсюды ёсьць нечым нездаволеныя, нечым пакрыўджаныя і на нешта злосныя.

У комсамоле ўвесь час прыходзіцца весьці барацьбу з настроем сярод адсталай і ўпадніцкай часткі моладзі.

Чырвоны дырэктар, бач, трымае руку майстра, а заўком дзень і ноч выдумвае, як-бы паспрытней зьнізіць зарплату.

Для маладых комсамольцаў, для нядаўна прышоўшай з вёскі моладзі іншы раз досыць нязначнага штуршка, каб яны ўспрынялі тэорыю эксплёатацыі, прыгнечаньня і г. д.

Васілю Бачкову не далі дроў у крэдыт. Не хапіла ордэраў, былі людзі, якія мелі большую патрэбу ў дровах, як ён. Хлопец уляцеў у заўком, як апараны:

— Чаму мне дроў не далі?

— Не далі па нейкім прычынам...

— За што—чорт пабяры, змагаліся?

Невядома, дзе іменна і з кім Бачкоў змагаўся, але праз некалькі хвілін гэты барацьбіт лаяў заўкомаўскіх прадаўнікоў. Вядома Бачкова з заўкому вывелі ды яшчэ прыцягнулі на бюро за лаянку.

Праз некаторы час, сабраўшы вакол сябе кучку хлапцоў, Васька трымаў прамову:

— Бюрократызм разводзяць, рэжым нявыносьлівы, чыноўнікі сядзяць і інш.

На тым-жа заводзе вышла другая гісторыя. Комсамолец М. лічыў сябе ў праве атрымаць вышэйшы разрад, але майстар—комуніст гэтага права за ім ня прызнаваў. Конфлікт разьбіраўся ў РКК і ўявеце сабе, гэта «бюрократычная ўстанова» вырашыла конфлікт не ў карысьць комсамольца М.

На комсамольскім сходзе М. гаварыў:

— Я думаў раней, што заўком, РКК—рабочыя організацыі, ахоўваючыя яго інтарэсы, цяпер я цьвёрда ўпэўнены, што пролетарыю шукаць аховы там ня прыходзіцца. Яго запыталі:

— А ты пробу здаў? Ён адказаў: здаў!

Хлопцы паціскалі плячыма, але М. пры гэтым забываў дадаць, што пробу ён здаў, але яе прызналі нездавальняючай.

Такі бюрократызм, такое чыноўніцтва!

Ёсьць хлопцы, якія знаходзяцца ў дрэнных матар'яльных умовах. Прыехаўшая з вёскі моладзь часта ня мае дзе жыць, валяецца па кутох. Комсамол і партыя вядуць бязупынную барацьбу з гэтым. Організоўваюцца агульнажыцьці, комуны, стараюцца павысіць зарплату. Але-ж адразу перавесьці гэтых хлапцоў у палацы няма магчымасьці, адразу на 6-ты разрад таксама не паставіш і хлапцам гаварыць: «Працуй, вучыся разам з партыяй, рабочай клясай, паляпшай сваё становішча».

А опозіцыя ім гаворыць:

— Ты бачыш, цябе эксплёатуюць, ты жывеш у горшых умовах, чым рабочыя буржуазных краін.—Мы вядзем барацьбу за павышэньне зарплаты, за паляпшэньне твайго жыцьця!

Вядома, што моладзь, якая яшчэ ня моцна стаіць на сваіх палітычных вагах, схіляецца ў той бок, дзе ёй не гавораць аб працы і цярплівасьці, а абяцаюць хуткі рай на зямлі.

Опозіцыі ў комсамоле прыходзіцца вербаваць у свае шэрагі ў першую чаргу гэтых «рэволюцыянэраў адважнасьці», хныкаючых, бязвольных комсамольцаў, нездольных мужасна весьці барацьбу з цяжкасьцямі.

Потым ідуць палітычна абойдзеныя «адважныя» рэволюцыянэры. Гэтыя абойдзеныя надзвычайным уздымам саюзу комсамольцы, ня маючыя сваёй часткі ні ў адным дасягненьні організацыі, гэтыя адважныя рэволюцыянэры падпяваюць партыйнай опозіцыі аб канчатковай пагібелі комсамольскай організацыі, аб адсутнасьці палітычнага твару саюзу.

Гора-рамантыкі.

Калісьці школьнікі, начытаўшыся Майн-Рыда і Жуль Верна, лежачы на вышках у часы заняткаў, марылі аб гэройскіх учынках, аб жорсткіх бойках з непераможнымі ворагамі.

Цяпер, папаўшы ў моцны, дыхаючы рэальнай рамантыкай колектыў, яны забылі аб «Огненных пер'ях», «аб Чырвоным клыку», аб «Слановым хрыбце».

Але гэтую струнку разбудзіла опозіцыя. Гэтым хлопцам яны напяваюць аб нелегальных сходах, аб кінематаграфічных труках, якія ім прыдзецца выконваць, аб небясьпецы быць выкрытым.

Другая частка з такіх-жа яшчэ непасьпеўшых увабрацца ў пер'е птушанят увесь час марыць аб старым дарэволюцыйным падпольлі.

І тыя і другія—комсамольцы, патрабуючыя да сябе ўважлівага падыходу, добрага комуністычнага выхаваньня. Але, калі можна дараваць „гэроям" ад трухлявых раманаў і мэмуарнай літаратуры, дык ніяк нельга дараваць вопытным спакусьнікам, якія адурманьваюць неразумныя галовы.

Шчэгалёва.

Дні ваеннай вучобы.

На дапрызыўных пунктах тысячы маладых рабочых і сялян рыхтуюцца стаць байцамі Чырвонай арміі.

Палепшым працу.

(Што ўхваліла вайскова-фізкультурная камісія ЦК ЛКСМБ).

Не сакрэт, што да гэтага часу кульгала комсамольская праца на тэрыторыяльных зборах дапрызпадрыхтоўцы і паміж імі. Ня было вызначаных форм працы з комсамольцамі—пераменьнікамі і дапрызыўнікамі, а таксама дэмобілізаванымі чырвонаармейцамі.

Улічваючы гэта, вайскова-фізкультурная камісія ЦК ЛКСМБ на сваім апошнім пасяджэньні абмеркавала пытаньне аб працы комсамольскіх організацый на тэрыторыяльных зборах і на дапрызпунктах. Вынесены цэлы шэраг пастаноў, якія ўносяць яснасьць у гэту галіну працы і зьявяцца кіраўнічымі дырэктывамі для вайскова-комсамольскай працы на мясцох.

У чым-жа конкрэтна выявіцца праца комсамольскіх організацый у часе тэрыторыяльных збораў і дапрызпадрыхтоўкі?

Перш за ўсё на мясцох павінна быць устаноўлена цесная сувязь камітэтаў і ячэек ЛКСМБ з комсамольскімі організацыямі адпаведных тэрчасьцей і пагоджаасьць ў пытаньнях працы сярод дапрызыўнікаў і пераменьнікаў.

Пад кіраўніцтвам камітэтаў і ячэек ЛКСМБ комсамольцы-пераменьнікі і дапрызыўнікі біруць на сябе ініцыятыву ў організацыі вайсковых гурткоў, куткоў ціраў, падпіскі на вайсковыя газэты дыінш.

Праводзяцца сыстэматычна сходы-конфэрэнцыі комсамольцаў дапрызыўнікаў і пераменьнікаў у мэтах азнаямленьня іх з бягучымі задачамі працы ў сваёй часьці, падвядзеньня вынікаў працы комсамольцаў на тэрзборах і дапрызпадрыхтоўцы.

Асаблівая ўвага з боку дапрызыўнікаў і пераменьнікаў павінна быць зьвернута на пропаганду ідэй ТСА-Авіяхіму ў сувязі з сучасным міжнародным становішчам, дамагаючыся максымальнага ўцягненьня моладзі ў шэрагі ТСА-Авіяхіму. Неабходна стварыць сталы кадр актыву, які зьяўляецца ініцыятарам правядзеньня ўсёй практычнай працы на ТСА-Авіяхіму.

У галіне культасьветнай працы на тэрзборах і дапрызпунктах перад намі стаяць задачы ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў і пераменьнікаў, вербаваньне сярод іх падпішчыкаў на вайсковыя газэты і літаратуру.

Выкананьне ўсіх гэтых мерапрыемстваў забясьпечыць нам падрыхтоўку грамадзкай думкі моладзі і насельніцтва наогул вакол збораў тэрчасьцей і дапрызыўнікаў, а таксама забесьпячэньне нормальнай комсамольскай працы на зборах і адпаведнага настрою беспартыйнай моладзі. **З.**



Дэзэртыраў няма.

29 лістапада пачалася яўка на дапрызыўныя пункты Менскай акругі. Усюды дапрызыўнікі зьяўляліся на пункты сваечасова, організаваным парадкам.

Па мэдыцынскім аглядзе аслабанёна ад праходжаньня дапрызыўнай падрыхтоўкі толькі 38 чалавек. Шмат хто з дапрызыўнікаў, не адчуваючы ніякіх хваробаў, зусім адмаўляўся ад праходжаньня мэдыцынскага агляду.

Раз, два,-левай!

Чутны былі словы каманды на Пляцу Волі, дзе 1-га сьнежня праводзіліся першыя занятні з дапрызыўнікамі.

Вось так, добра!—Камандзір хваліць дапрызыўнікаў за тое, што яны ўважліва адносяцца да заняткаў.

Стралкова - тактычнай падрыхтоўцы дапрызыўнікаў у гэтым годзе зьвяртаецца асаблівая ўвага. Акрамя гэтага кожную раніцу дапрызыўнікі займаюцца фізкультурай.

У 4 гадзіны дню дапрызыўны пункт крыху пусьцее. Большасьць дапрызыўнікаў пакідае пункты і разыходзіцца па сваіх хатах.

А назаўтра ізноў у казарме, ізноў біруцца за вайсковую вучобу.

Міх. Зак.

На дапрызыўным пункце.

2 комсамольскія колектывы.

У мэтах вядзеньня комсамольскай працы сярод беспартыйных дапрызыўнікаў, на менскім пункце організаваны 2 колектывы комсамольцаў—дапрызыўнікаў.

Мэдыцынскае абслугоўваньне дапрызыўнікаў.

Для амбуляторнага лячэньня дапрызыўнікаў Менскі пункт прымацаваны да 1-ай і 2-ой амбуляторый.

У раёнах мэдыцынскае абслугоўваньне дапрызыўнікаў ускладаецца на бліжэйшыя ад іх амбуляторыі.



Маладняк Меншчыны на дапрызыўнай падрыхтоўцы.

У казарме.

Зараз падлогі ў пакоях акрваенкамату ня зьзяюць той чыстатою, якой яны зьзялі яшчэ месяц таму назад, калі прызыўнікі 1905 году ў гэтых-жа пакоях праходзілі праз мэдыцынскі агляд. Тады тут была свайго роду амбуляторыя зараз-жа казарма дапрызыўнікаў. Імення, казарма. Самая суровая, чырвонаармейская дысцыпліна ўведзена ў гэтым годзе на дапрызыўным пункце.

Амаль на ўсіх пунктах дапрызыўнікі размешчаны на інтэрнатах, я ія знаходзяцца на становішчы казармаў чырвонаармейцаў.

На ўсіх дапрызыўных пунктах адчынены куткі і клюбы, дзе праводзіцца культ-асьветная праца сярод дапрызыўнікаў. Клюбы забясьпечаны патрэбнай літаратурай.

Усё падрыхтована.

Пункты, як мы ўжо казалі, маюць належнае абсталяваньне.

На некаторых пунктах з 1-га сьнежня пачалося ўжо катлавое харчаваньне за дзяржаўны кошт. Харчы атрымоўваюць усе дапрызыўнікі, якія ня маюць пэўнага заробку на вытворчасьці ці ва ўстанове.

Усе дапрызыўныя пункты Меншчыны ўкомплектаваны належным камандна-політычным складам, 2/3 якога складае сярэдні і 1/3 малодшы комсклад запасу.

У дастатковай колькасьці ёсьць вінтоўкі і іншыя вайсковыя прылады.

На мясцох дапрызыўныя пункты маюць самую цесную сувязь з райсаветамі ТСА-Авіяхіму, райкомамі партыі і комсамолу, якія дапамагаюць дапрызыўным пунктам у штодзённай працы.

Як хто адзначыў Кастрычнік.

Комсамольцы кіравалі усёй урачыстасьцю.

№ 23. Бабоўская яч. ЛКСМБ, Бабруйская акруга.

На адным з пасяджэньняў нашага сельсавету былі падведзены вынікі сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі. Старшыня камісіі па правядзеньні сьвята комсамолец Чорна-Вірынскай ячэйкі зрабіў інфармацыю. Было адзначана што сьвята прайшло з вялікім уздымам, аб чым сьведчаць шматлюдныя дэмонстрацыі і таварыскія сялянскія вечары па ўсіх вёсках.

Калі летась былі выпадкі, што ў самае сьвята сяляне працавалі, дык сёлета гэтага нідзе ня было. 6-7-га лістапада відна было сьвята ў кожнай хаце.

Кіраўніком у правядзеньні сьвята была комсамольская ячэйка, якая працуе ў цеснай сувязі з саветам.

Ячэйка сумесна з культкамісіяй сельсавету падрыхтавала адчыненьне 2-х чырвоных куткоў у **Бабоўцы** і **Луганой Вірні** і адну школу малапісьменных у Чорна-Вірынскай хаце-чытальні.

А. Акінчыц.



З вялікім запалам да новых перамог.

№ 24 Азяранская яч. ЛКСМБ, Рагачэўскі раён.

Хоць падрыхтоўчая праца да правядзеньня Кастрычніка была невялікая—усяго тры тыдні,—але праведзенае сьвяткаваньне кажа аб тэй вялікай працы, якую прарабіла ячэйка ЛКСМБ па растлумачэньню сялянству гісторыі і значэньня Кастрычніка для прыгнечаных усяго сьвету.

Першая практычная праца ячэйкі гэта—упрыгожваньне хаты-чытальні, некалькі брам, пабудаваньне трыбуны, упрыгожваньне тэатру і інш.

За тыдзень да сьвята па ўсіх населеных пунктах былі прачытаны даклады: **«што даў Кастрычнік сялянству і дасягненьні за 10 год у ва ўсіх галінах савецкага будаўніцтва»**.

6-га лістапада ўвечары адбыўся урачысты пленум сельсавету, дзе комсамол зрабіў падлік дасягненьняў у працы сельсавету і продэманстраваў іх перад шырокімі масамі сялянства—гэта пабудаваньне селькомам паравога млыну, новай школы, коопэратыву і г. д.

7-га лістапада адбыўся мітынг, дзе комсамольцы сваімі рэволюцыйнымі сьпевамі ўзьнімалі настрой сялянства ў час дэмонстрацыі. На мітынгу ня быў толькі той, хто ня мог ісьці па старасьці, або застаўся ў хаце з малымі дзецьмі. Сівабародыя дзядзькі ўсе былі на мітынгу, дэлегаткі пастроіўшыся ў шэрагі, як чырвонаармейцы тут, сялянкі-дзяўчаты, моладзь суседніх вёсак, тут піонэрскі атрад важна трымае сьцяг: **«мы давядзем справу Ільліча»**.

Ня гледзячы на «будні» дзень—панядзелак, выгляд ува ўсіх сьвяточны, што відна па вопратцы кожнага прысутнічаўшага. Праходзіўшы па вуліцы бачылі упрыгожаныя вароты двароў комсамольцаў, піонэраў, вучняў і інш.

Але ня толькі дэмонстрацыяй і мітынгам адзначалі мы сьвята, быў пастаўлен комсамольцамі спэктакль у «Тыя дні», які паказаў селяніну «цені крывавай мінуўшчыны» панскіх бізуноў і зьдзекаў.

Ячэйка адчыніла вайсковы куток, набыла грошы для вінтоўкі, адрамантавала масты і дарогі. Гэта першы гаспадарчы падарунак Кастрычніку. Адчыненьне лікпункта, які наведвае большасьць дэлегатак, усё гэта яскрава сьведчыць аб тэй вялікай працы, якую правяла Азяранская ячэйка за тры тыдні падрыхтоўкі.

Гэта сьвяткаваньне зьявілася лепшым запалам у сэрцах сялян да далейшага змаганьня за паляпшэньне свайго жыцьця, да далейшых дасягненьняў па шляху будаўніцтва новай соцыялістычнай вёскі.

Я. М. Савіцкі.



Выведзем піонэр-організацыю з паўбяспрытульнага становішча.

Прамова тав. Адзінца на XI зьезьдзе КП(б)Б у спрэчках па дакладу ЦК КП(б)

— Я буду гаварыць выключна па адным пытаньні—гэта аб выхаваньні трэцяга пакаленьня, аб нашым дзіцячым комуністычным руху.

Што сказала партыя?

— За апошнія гады піонэр-рух стаў зьявішчам буйнейшага політычнага значэньня. Мацнейшы рост піонэр-організацыі і агромністая роля ў справе выхаваньня трэцяга пакаленьня, пэрспэктывы руху не ўзбуджаюць сумненьняў. Але і ў гэтай галіне відочны, бяссумненна, шэраг зьявішчаў, якія сьведчаць аб неабходнасьці настарожанай увагі партыі да проблемы выхаваньня трэцяга пакаленьня.

Захапленьне з надворнасьцю, формай, пад якімі часта няма выхаваўчай працы па сутнасьці: гэта праяўляецца ў барабанаманіі з аднаго боку, і ў голым «політыцызьме»—з другога боку. Такога роду захапленьні маюць сваім адваротным бокам адсутнасьць сыстэматычнай і фактычнай працы над дзіцём, няўвагу да бытавых і іншых проблем, хвалюючых яго ў прыватнасьці ў палавой проблеме (з пастановы 14 зьезду ЎсеКП(б).

«І ня менш важнай проблемай зьяўляецца задача перавыхаваньня дзіцячага пакаленьня ў духу комунізму, якое-б забясьпечвала пераемнасьць 3-га пакаленьня ў справе соцыялістычнага будаўніцтва» (з пастановы IX зьезду КПБ).

На мэтад заданьняў.

Мінулыя два гады комсамольская організацыя, якая непасрэдна займаецца працай сярод дзяцей і кіраўніцтвам піонэр-організацыі, стала займалася гэтай працай. Трэба сказаць, што ўся праца перабудавана ў корані пановаму. Калі ў дырэктывах 14 зьезду адзначалася, што мы ўсю працу будавалі выключна на славеснасьці, а на гэтым выхаваць сталага комуністага ня зможам, мы перайшлі ў працы, на так-званы мэтад заданьняў, гэта значыць, што дзіця павінна выконваць працу, хоць самую маленькую, але такую, якая-б мела некаторае выхаваўчае значэньне.

Організацыя досугу піонэраў вельмі важная справа, бо калі ў атрадзе ня будзе зацікаўленасьці, калі дзіця атрад не задаволіць, калі там ня будзе разнастайнасьці і вясёласьці, дык дзіця ня пойдзе ў атрад. Гэта ў нас наглядалася ў зьвязку з неадпаведнасьцю гэтай працы запатрабаваньням дзіцячых мас.

Маленькія гаспадары.

Мы маем некаторае паляпшэньне па сельска-гаспадарчай працы нашых вясковых піонэр-атрадаў (закладка градак, закладка паказальных агародаў пры школах і г. д.). Мы таксама мелі некаторае паляпшэньне працы піонэраў у сваёй гаспадарцы; мы таксама маем некаторае паляпшэньне ў горадзе ў тым сэнсе, што дзеці набываюць больш тэхнічных ведаў, але ўсё гэта нас сёньня ня можа задаволіць.

Як мы расьлі.

У дырэктывах IX зьезду КПБ па росту піонэр-організацыі сказана: «рост піонэр-організацыі неабходна накіроўваць у бок большага ўцягненьня дзяцей рабочых і сялян, адначасова пашыраючы соцыяльную базу росту, уцягваючы дзяцей саматужнікаў і служачых і г. д., ставячы гэтым задачу перавыхаваньня ў комуністычным духу ўсяго ўзрастаючага пакаленьня».

Мы за час з 1 студзеня 26 г. па 1 лістапада 27 г. вырасьлі на 19 тысяч 799 чалавек і на 749 піонэр-атрадаў (разам з Гомельшчынай) (з 53340 чалавек і 1207 атрадаў да 73139 чалавек і 1956 атрадаў). Рост адбываўся шпарка да жніўня 26 году, а з гэтага часу ў нас пайшло надзвычайна вялікае зьмяншэньне, прыблізна з гэтага часу ў нас выбыла каля 10-11 тысяч дзяцей. Гэта гаворыць аб тым, што дырэктыва X зьезду КПБ і 14 зьезду партыі аб паляпшэньні гэтай працы яшчэ не знайшла досыць глыбокага пераламленьня ў працы нашых атрадаў.

У апошнія часы, у зьвязку з тым, што мы імкнуліся гэтую працу палепшыць, мы ня маем ужо памяншэньня, але назіраецца вельмі вялікая бягучасьць. За апошнія 6 месяцаў прыбыло каля 5 тысяч, і ў той-жа самы час выбыла каля 5 тысяч. Адны прышлі, другія выйшлі.

Падрыхтаваць кваліфікаванага павадыра!

Усё тое, што прадпрынята — недастаткова. Піонэр-рух яшчэ ня стаў прадметам увагі ўсёй КПБ і комсамольскай організацыі, як гэта зазначана ў дырэктывах IX зьезду КПБ. Асноўная проблема ў піонэр-руху гэта тое, каб наша організацыя змагла задаволіць запатрабаваньні дзяцей, каб мы маглі добра кіраваць гэтаю працаю—гэта значыць, што:

«Неадпаведнасьць моцнага колькаснага росту піонэр-організацыі і слабога росту адпаведнай кваліфікацыі кіраўнічых кадраў іх. Самая вострая проблема піонэр-руху—гэта **проблема падрыхтоўкі кваліфікаванага павадыра, пісьменнага ня толькі політычна, але хаця-б элемэнтарна-пісьменнага ў мэтодычных і пэдагогічных адносінах»** (з пастановы 14-га зьезду УсеКП(б).

«І найсур'ёзьнейшай задачай зьяўляецца ўмацаваньне добра падрыхтаванымі працаўнікамі (павадырамі атрадаў, кіраўнікамі дзіцячых бюро і г. д.), (з пастановы IX зьезду КПБ).

Вызначаныя проблемы зьяўляюцца актуальнейшымі і на сёньняшні дзень. Што-ж мы бачым на самай справе. Мы бачым, што на піонэрпрацу ніхто ня хоча ісьці, бо таварыш на прадпрыемстве ля варштату атрымлівае 90—100 руб., а калі яго пасладь на піонэрпрацу, ён павінен атрымліваць 28-30 руб., таму ні адзін ня хоча ісьці. Далей мы кажам, што нам патрэбны кваліфікаваныя людзі ў пэдагагічных адносінах, каб яны мелі пэдагагічныя навыкі, але мы настаўніка таксама ня зможам паслаць.

„Трэці сын“.

Ёсьць яшчэ недаацэнка гэтае працы нашымі таварышамі. Некаторыя досыць адказныя таварышы Менскай акругі раўняюць піонэрскую, надзвычайна цяжкую працу піонэрскіх працаўнікоў з працаю бальнічнай сідзелкі, кажучы бальнічная сядзелка атрымлівае 15 руб., столькі-ж можа атрымліваць і раённы піонэрпрацаўнік. Папрабуйце тады паслаць пры такім забясьпечаньні здольнага чалавека.

Акрамя таго, ходзіць вельмі ядавіты нягодны анэкдот, які садзейнічае такім настроям і не дае магчымасьці пасылаць на гэтую працу добрых працаўнікоў. «Былі ў бацькі тры сыны—два разумныя, а трэці—піонэрпрацаўнік» (сьмех). Гэты анэкдот пашыраецца і таварышы—члены партыі, якіх мы пасылаем на піонэрпрацу, кажуць: «да ну вас к чорту з вашай піонэрпрацай, чым я горшы за другіх, я лепей пайду на самую простую працу, на працу тэхнічнага сэкратара ячэйкі, чым быць трэцім «самым разумным» у комсамольскай ячэйцы».

Дапамагчы піонэрскаму друку.

Дзіцячая часопісь, якая ёсьць на Беларусі, надзвычайна бедная. Каштарыс складаўся казённа, бяз вучоту нашых прапаноў і мы не атрымалі магчымасьці палепшыць яе становішча. Мы ня можам задаволіць запатрабаваньняў дзіцячых мас малодшага ўзросту да 10 год, ня гледзячы на запатрабаваньні бацькаўскіх мас. Возьмем, напрыклад, Менскую вельмі вялікую організацыю (больш 5.000 у горадзе), а між іншым мы бачым, што 4 гады яна рамантуе піонэрскі клюб і гэты піонэрскі клюб да гэтага часу бяз столі.

Тое самае і ў адносінах агульна-гарадзкой працы нашых піонэратрадаў. Няма дзе зьбірацца. Наглядаюцца яшчэ няўважлівыя адносіны з боку парт'ячэек.

Адначасова з гэтым мы адзначаем, што акруговыя організацыі і ЦК партыі за апошні час больш заняўся пытаньнямі піонэрпрацы, чым раней. Наркамасьветы таксама за апошнія месяцы больш прымае ўдзел у піонэрскай працы. Павялічваецца ўвага бацькоў да працы піонэратрадаў. Профсаюзныя органы, асабліва акруговыя і часткова раённыя, надта несьпагадна адносяцца, слаба дапамагаюць у працы піонэрскім бюро, матар'яльная дапамога ўрэзваецца.

11 зьезд партыі павінен уключыць у рэзолюцыю пункт аб тым, каб нашыя адказныя працаўнікі і ўсе організацыі не забывалі дапамагаць піонэрскай організацыі, каб тым самым вывесьці яе з паўбяспрытульнага становішча,

Да перавыбараў КСТУ.

Дзе камітэт працуе добра, там сяляне пераходзяць на шматпольле, паляпшаюць свой дабрабыт.

Дзе „камітэтчыкі“ сьпяць, там „грачы“ гаспадараць над малатарняй

Лепшых таварышоў--на працу

Што ты павінен зрабіць у часе перавыбараў КСТУ.

Перавыбары сельскіх і раённых Камітэтаў Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі па Беларусі адбудуцца ў сьнежні месяцы бягучага году.

Гэта кампанія павінна праводзіцца пад лёзунгам **канчатковага замацаваньня саюзу бедняка з серадняком праз сялянскія таварыствы ўзаемадапамогі, канчатковага замацаваньня структуры камітэтаў, замацаваньня набытыхся дасягненьняў камітэтаў у галіне гаспадарча-вытворчага пытаньня і падбору працаздольных працаўнікаў у кіруючыя органы камітэтаў і рэвізійныя камісіі.**

Ставячы ў вугал вуглу адзначаныя лёзунгі пры перавыбарах усім мясцовым савецкім, партыйным, а разам з гэтым і комсамольскім організацыям, як актыву вясковай моладзі, неабходна прыняць самы актыўны і непасрэдны ўдзел у адзначанай кампаніі, **ставячы перад сабою мэтай садзейнічаньня камітэтам і партыйным органам да найбольшага ўцягненьня ў перавыбарчую кампанію шырокіх мас батрацкага і бядняцка-серадняцкага насельніцтва вёскі, садзейнічаньня выяўленьню іх актыўнасьці да дзелавой крытыкі і самакрытыкі працы камітэтаў у напрамку плянавасьці і мэтазгоднасьці скарыстоўваньня сродкаў, большага абслугоўваньня патрэб сяброў таварыства, узмацненьня мат'рыяльнага становішча і разьвіцьця вытварчай дзейнасьці.**

Аднячасова з гэтым ячэйкам ЛКСМБ і пасобным комсамольцам неабходна аказаць дапамогу партыйным ячэйкам у правядзеньні сходаў беднаты, дзе павінны быць абмяркованы практычныя мерапрыемствы па палепшаньню працы камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, а таксама абгавораны і кандыдатуры асабовага складу выбарчых органаў камітэтаў.

На агульных адчыненых сходах ячэек ЛКСМБ і пасяджэньнях бюро райкомаў неабходна заслухаць справаздачы комсамольцаў, працуючых у камітэтах, і ўважліва прыглядзеўшыся да дасягненьняў і хібаў у працы гэтых таварышоў на падставе гэтага абгаварыць пытаньне аб высоўваньні кандыдатур з лепшых, праявіўшых і апраўдаўшых сябе на грамадзкай працы комсамольцаў у кіруючыя і рэвізійныя органы камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, з якімі мець цесную сувязь у штодзеннай далейшай іх працы, даючы ім надежнае сваечасовае кіраўніцтва і патрабуючы ад іх справаздачнасьці.

П. Асіпчык.



Ад добрай працы КСУ--беднаце прыбытак.

(Прапойск, Магілеўская акруга)

За апошнія гады сяляне Прапойскага раёну амаль на ўсе сто процантаў перайшлі на шматпольную сыстэму землякарыстаньня.

Вялікую ролю ў гэтай справе **адыгралі сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства і камітэты сялянскай узаемадапамогі.**

Яны давалі бяднейшаму сялянству культурныя травы для ўвядзеньня правільнага севазвароту, адпушчалі ў крэдыт сартаванае насеньне збожжа і тэхнічных культур.

Дзякуючы гэтым мерапрыемствам сяляне на многа павялічылі ўраджай са свайго поля. Напрыклад, **раней намалачвалі з дзесяціны 55-60 пудоў, а цяпер 90-100.**

Прапойскія комсамольцы зараз рыхтуюцца да перавыбараў камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. У ячэйцы ёсьць думка наладзіць шырокі «узаемадапамогаўскі» вечар сялянскай моладзі.

Г.



Супынілі сваркі і збудавалі мост.

(Засьценкаўская ячэйка ЛКСМБ, Лядлянскі раён, Аршаншчына).

У нас комсамольцаў зусім мала — толькі 5 чалавек. Але хлопцы дружныя і ячэйковая праца з кожным днём узмацняецца.

Засьценкаўцы некалькі год „думалі“ збудаваць мост і наладзіць грэблю ў канцы вёскі. Зьбяруцца на сход, пасварацца ў ахвоту і на гэтым канец.

Комсамольцы дагаварыліся з камітэтам сялянскай узаемадапамогі, сельсаветам, вышлі з піонэрамі і часткай перадавой беспартыйнай моладзі, збудавалі мост і наладзілі грэблю.

Цяпер сяляне езьдзяць па добрай дарозе і больш ня сварацца.

С. Мінін.



Малатарню „грачы“ расьцягнулі.

(Чарнаруцкая ячэйка ЛКСМБ, Шклоўскі раён).

Зусім нічога ня робіць Чарнаруцкі камітэт таварыства сялянскай ўзаемадапамогі. Старшыню, як кажуць, днём з агнём не знайсьці. Бедната ўжо амаль цэлы год пра камітэт нічога і ня чула: ёсьць сумненьні нават у яго існаваньні.

У камітэце была малатарня. Цяпер ходзяць чуткі, што часткі ад гэтай дарагой і карыснай машыны парастрадвалі, а косьці самой малатарні валяюцца пад страхою пуні аднаго гаспадара.

Надыходзяць перавыбары камітэтаў, толькі бяда ў тым, што сяляне ня ведаюць, **каго прыдзецца перабіраць.**

Чарнаруцкай комсамольскай ячэйцы трэба зьвярнуць на гэта вялікую увагу, прыняць у перавыбарах найактыўнейшы удзел і у новы склад камітэту сялянскай узаемадапамогі абраць працаздольных, сумленных таварышоў.

Вясковы.

Перазаключэньне колдагавораў

—„Комсамол сапраўды ахоўвае інтарэсы моладзі“—гаварылі вучні брыгад, пасьля заключэньня новых колдагавораў.—Вучні менскіх саматужнікаў-скурнікаў і да гэтага часу эксплёатуюцца. не атрымліваюць зарплату к тэрміну. А дзе комсамольская ячэйка?—Што гавораць конфэрэнцыі рабочай моладзі.



Што сказала рабочая моладзь.

(Віцебск).

26-га лістапада адчынілася гарадзкая конфэрэнцыя рабочай моладзі.

З дакладам аб экономічным становішчы моладзі выступіў т. Крупенін.

— За апошнія гады мы маем вялікія дасягненьні ў гэтых адносінах.

Возьмем зарплату.

Калі на фабрыцы «Дзьвіна»—моладзь раней па 2-му разраду атрымлівала 18 рублёў, цяпер атрымлівае 26 руб. 50 к., 4-ы разрад атрымліваў 28 руб., цяпер 32 рублі. На акулярнай фабрыцы сярэдні зарабак моладзі выражаўся ў 45 р.—цяпер—65 рублёў. Акрамя таго, моладзь удзельнічае ў прыработку нараўне з дарослымі рабочымі. У цяперашні час уводзяцца новыя тарыфныя сеткі для моладзі, пры заключэньні якіх прадугледжана недапушчэньне памяншэньня ставак да зарплаты.

За апошні год праведзена вялікая праца па разбраніраваньню вучняў. У большасьці выпадкаў разбраніраваныя скарыстоўваюцца на кваліфікаванай працы. Былі ненармальнасьці ў гэтых адносінах. Так, на заводзе № 1 Метпраму, адміністрацыя разам з фабкомам наладзіўшы ўрачысты выпуск 6 вучняў, іх ўсё-ж не скарыстала, альбо калі адміністрацыя фабрыкі «Профінтэрн» адмовілася запоўніць брон.

Востра стаіць пытаньне з беспрацоўем.

У прынятай рэзолюцыі конфэрэнцыя азначыла значныя дасягненьні ва ўзмацненьні экономічнага становішча рабочай моладзі.

Т—кі.

Абаронім вучняў.

(Менск, саюз скурнікаў).

Усяляка эксплёатуюць саматужнікі сваіх вучняў. А тыя, мала сьвядомыя, ды яшчэ жадаючыя навучыцца рамяслу, усё пераносяць, не паведамляючы саюз.

Над вучнямі «нецярплівымі» ў гэтых адносінах абвяшчаюцца байкоты на сходах саматужнікаў (сход у лістападзе г. г.). А што робіць таварыства саматужнікаў? Яно часта нават ахоўвае інтарэсы саматужнікаў. (Справа Касавера з Фітэрштэйнам).

У рэдкіх выпадках вучні працуюць вызначаны час, аб гэтым гаворыць абсьледваваньне.

У саматужніка **Зарэцара** (Кастрычнікавая, 12) вучань заяўляе: «не магу сыйсьці з працы ў 4 гадзіны, бо на заўтра—лепш не зьяўляйся на працу: Зарэцар зьесьць». Вучань просіць профупаўнаважанага прыходзіць штодзённа і зьнімаць яго з працы.

У саматужніка **Левіна** (Гандлёвая вул.) тая-ж гісторыя, але з той розьніцай, што вучань прыходзіць на працу а 6-ай гадзіне раніцою.

Часта саматужнікі ня выплачваюць зарплату к тэрміну, а бывае і зусім ня выплачваюць яе. Да гэтай катэгорыі належаць і арцелі. Напрыклад, саматужнік —шорнік **Вайн** бяз суда ніколі зарплату не дае сваім вучням. Арцель «Чырвоны Багатыр» вінна сваім вучням зарплату за некалькі месяцаў. Саматужнікі не абучаюць вучняў, а скарыстоўваюць іх на адных пачынках (Элентух, Касавер і інш.), нелегальна бяруць рабочых, залічваюць іх на патэнт, каб не плаціць узносаў, (Рудэрман, Гольдзін, Тэпер.—скурныя прадпрыемствы) зусім не прызнаюць законаў і не жадаюць іх выконваць (Вінік, Гэль).

Прокуратуры трэба зьвярнуць увагу на гэтыя зьявішчы і прыцягнуць саматужнікаў да адказнасьці.

М. Вольны.

Здаволены новым колдагаворам.

(Менск).

— Хлопцы!—сказаў адзін з маладых брыгаднікаў,—хутка будзе заключацца нанава колектыўны дагавор. Трэба будзе нам за сябе пастаяць.

Рашыў маладняк заводу «Восход» унесьці ў дагавор дапаўненьні наконт вучобы, наконт зарплаты.

І калі маленькі завадзкі клюб запоўніўся рабочымі і сталі зацьвярджаць дагавор, хлопцы выступілі.

Прапануем павялічыць пэнсію па 1-му разраду з 14 руб. 50 кап. да 17 руб.

Спачатку пачала ўпірацца адміністрацыя:—нельга—адказвала. Але-ж пад напорам моладзі янэ згадзілася дадаць да 17 рублёў—першаму разраду.

Дадалі яшчэ пункт, адносна атрыманьня кваліфікацыі. У новым дагаворы ўнесьлі пункт аб неабходнасьці стварыць брыгаду вучнёўства.

Доўга «пацелі» над пытаньнем аб майстрох.

—Майстры знаходзяцца на зьдзельнай працы, і не зацікаўлены ў абучэньні вучняў. Заўсёды майстар адказвае: «няма часу». Унесьлі ў дагавор пункт аб аплаце майстром за вучэньне.

Хлапцы засталіся здаволенымі.

— Цяпер вучыць нас будуць!

У новым дагаворы вялікая ўвага зьвернута на сваечасовае атрыманьне пэнсіі.

Новы колдагавор унёс шмат паляпшэньняў у становішча моладзі. **Мазо.**

На конфэрэнцыі проф'актыву.

(Полацак).

На нарадзе профактыву моладзі 25-ХІ, на якой прысутнічала звыш 30 маладых профактывістаў былі заслуханы вынікі аб Усебелар. нарадзе моладзі пры ЦСПСБ і аб удзеле моладзі ў кампаніі па перазаключ. кол. умоў.

Выступаўшыя ў спрэчках краналіся ўсіх галін эконом. работы сярод моладзі. Яны адзначалі, як недахопы, што няма плянавасьці ў рабоце экспэртных камісій, і што яны наогул яшчэ слабы. Інструктары брыгад матар'яльна дрэнна забясьпечаны і скарыстоўваюцца на іншай працы.

Прыкмячаюцца яшчэ нядбайныя адносіны з боку часткі адміністрацыі да абучэньня і няправільнае скарыстоўваньне броні.

Конфэрэнцыя дала наказ аб актыўным удзеле моладзі ў кампаніі перазаключэньня колектыўных дагавораў. Моладзь гаворыць конфэрэнцыя, павінна ўдзельнічаць у гэтай кампаніі, шляхам праверкі выкананьня ўсіх пунктаў старых дагавораў, удзельнічаньня на сходах па абгаварэньні новых дагавароў, уключэньня пунктаў, якія тычацца моладзі, як-то: аб кампэнсіраваньні майстроў за абучэньне вучняў і аб лепшай пастаноўцы вучнёўства наогул.

З. Фрудко.

Міжнародны агляд.

Эўропа напярэдадні вайны.

Пах дыму на Бальканах.—Ліга Нацый прыкрывае далейшае ўзброеньне.—Францыя супроць Італіі.—Замэры пана Пілсудзкага.

Бальканы—парахавая бочка.

У той час, як у Жэневе сабраліся абгаварваць пытаньне аб абмежаваньні вайсковай зброі, у Эўропе разгортваюцца падзеі зусім іншага характару.

На Бальканскай паўвысьне супярэчнасьці між дзяржавамі такія вялікія, што Бальканы зараз нездарма называюцца парахавой бочкай, якая можа ўзарвацца кожную гадзіну.

Францыя падпісала ўгавор з Паўднёва-Славіяй, які накіраваны супроць Італіі і Албаніі.

Італія і Албанія падпісалі ўгавор накіраваны супроць Паўднёва-Славіі, а значыцца і Францыі.

Іншыя бальканскія дзяржавы, як Грэцыя, Баўгарыя і Румынія таксама знаходзяцца паміж сабою ў дрэнных адносінах.

Чэха-Славакія ідзе на повадзе Францыі. Вэнгрыя—у Англіі.

За сьпіной Італіі стаіць Англія.

І ўсе гэтыя «хаўрусы» вялікіх дзяржаў з малымі маюць свае асобныя тайныя пляны.

Кожная з вялікіх дзяржаў імкнецца праглынуць некалькі маленькіх.

Хлусьня буржуазных міністраў.

Францускі міністр замежных спраў Брыян, які падпісаў угавор ад імя францускай буржуазіі, запэўняе, што ўгавор прадыктаваны самымі бескарыснымі пачуцьцямі.

— «Угавор не зьмяшчае ў сабе нічога такога, што-б накіравана супроць якога-небудзь трэцяга боку і цалкам адпавядае духу Лігі Нацый».

Растлумачваць тут ня трэба таму, што нашаму чытачу «дух Лігі Нацый» добра вядомы.

Але аднак трэба заззначыць яшчэ адно, што выкрывае хлусьню буржуазіі.

Угавор між Францыяй і Паўднёва-Славіяй мае адзін хворы пункт,—зусім не галубінага, а больш воўчага паходжаньня.

Згодна гэтаму пункту, Францыя і Паўднёва-Славія **абавязваюцца** «у выпадку нявыкліканага нападу трэцяга боку падтрымаць адна другую».

Як бачыце ў гэтым угаворы запраўды такі пануе «дух Лігі Нацый».

Францускія банкіры ўжо маюць сабе дзяржаву абавязаную ўгаворам, якая будзе падтрымліваць францускі імпэрыялізм у барацьбе з «трэцім бокам».

Імя гэтаму трэцяму боку—Італія.

Фашысцкай Італіі цесна ў сучасных межах. Мусаліні ў сваіх вялікадзяржаўных марах даўно ўжо рассунуў межы Італіі да берагоў Міжземнага мора, пераступіўшы праз Бальканы.

І нездарма Албанія—суседка Паўднёва-Славіі падпала ў залежнасьць Італіі.

Паводле апошняга ўгавору Італіі з Албаніяй, гэта краіна фактычна пазбавілася незалежнасьці, зрабілася колёніяй Італіі.

У Албаніі працуюць толькі італьянскія банкі.

Італія будуе тут чыгункі, якія павінны прайсьці праз Паўднёва-Славію, Італьянскія афіцэры навучаюць албанскую армію.

Паўднёва-Славія —гэта хаўрусьніца Францыі пад прыцэлам італьянскіх гармат, якія ўмацаваліся на горах Албаніі.

І якімі хлусьлівымі, пасьля ўсяго гэтага здаюцца словы Бальдвіна, які сказаў, што: Ліга Нацый у значнай меры дапамагла зьнішчэньню страхаў і падазрэньняў, якія зьяўляліся перашкодаю да разбраеньня».

І тут «дух Лігі Нацый».

Але яшчэ больш бліжэйшая небясьпека вайны знаходзіцца на польска-літоўскай мяжы.

Пілсудзкі зьбіраецца пашырыць свае межы за кошт захопу Літвы.

З гэтаю мэтай ён зьбірае свае войска на літоўскую мяжу, групуе ўсе цёмныя сілы Польшчы і Літвы, каб яны організавалі ўнутраны пераварот.

Конфлікт знаходзіцца ў такім становішчы, што для яго ліквідаваньня павінны ўмяшацца і іншыя дзяржавы.

Вялікае нездавальненьне канфліктам адзначана ня толькі намі, але і Нямеччынай і Латвіяй.

Для Нямеччыны і Латвіі ня выгадна ўзмацненьне Польшчы.

Падзеі на польска-літоўскай мяжы маюць сур'ёзнае значэньне.

Усе гэтыя пляны імпэрыялістых, якія складаюцца ў «духу Лігі Нацый», павінны атрымаць моцны адпор з боку рабочай класы і ўсіх працоўных сьвету, якія стаяць на ахове справы міру.

Алёнін.

Саюзныя навіны.

9 гадоў ЛКСМБ. 15-га сьнежня мінае 9 гадавіна існаваньня камсамольскай арганізацыі Беларусі.

Бюро ЦК ЛКСМБ ухваліла адзначыць па арганізацыі гэты юбілей сходамі з дакладамі аб гісторыі ЛКСМБ, а таксама ячэйковымі вечарамі.

Да акруговых зьездаў ЛКСМБ. Бюро ЦК ЛКСМБ ўхваліла раіць наступны парадак дню акруговых зьездаў ЛКСМБ, якія адбудуцца ў пачатку 1928 году.

1) Вынікі 11-га зьезду КП(б)Б і 15-га зьезду УсеКП(б). 2) Даклад ЦК ЛКСМБ. 3) Справаздача акругкому ЛКСМБ. 4) Праца сярод піонэраў па акрузе. 5) Выбары акругкому, рэўкамісіі і дэлегатаў на ўсебеларускі зьезд.

Узмацніць ваенізацыю. ЦК ЛКСМБ прапанавала вайскова-фізкультурным камісіям пры акругкомах правесьці праверку выкананьня дырэктыў па сатаварыству арганізацыі з Чырвонай арміяй.

Для гэтага камісіям належыць абсьледваць вайсковую працу некалькіх тыповых ячэек, а таксама правесьці сумесныя сходы ячэек з вайсковымі групамі, прысьвечаныя пытаньням сатаварыства.

Рабочую моладзь у комсамол. Бюро Менакругкому ЛКСМБ абгаварыла пытаньне аб уцягненьні новых кадраў рабочай моладзі ў ЛКСМБ.

Прапанавана ўсім райкомам разгарнуць шырокую кампанію ў вытворчых ячэйках па ўцягненьню рабочай моладзі ў КСМ, прычым зьвярнуць асаблівую увагу на прыём **кваліфікаванай рабочай моладзі.**

Прыём у комсамол будзе праводзіцца на адчыненых сходах комсамольскіх ячэек у прысутнасьці беспартыйнай моладзі.

Лепшых комсамольцаў у партыю. На грунце партыйных дырэкты бюро Менакругкому ўхваліла правесьці кампанію за ўцягненьне ў КП(б)Б комсамольцаў-рабочых, асабліва па буйных прадпрыемствах.

Згодна пастановы АК, належыць рэкамэндаваць у КП(б)Б лепшых рабочых-комсамольцаў, праверанных на саюзнай і грамадзкай працы. Пытаньне аб уцягненьні ў партыю комсамольцаў павінна быць спэцыяльна абмеркавана на сходах усіх вытворчых ячэек, а таксама ўзгоднена з мясцовымі ячэйкамі КП(б)Б.

Беспрацоўе сярод моладзі будзе значна паменшана.

30 тысяч на арганізацыю брыгад і вытворчых майстэрняў

Наркампрацы мяркуе адпусьціць у гэтым годзе 30 тысяч рублёў на барацьбу з беспрацоўем выключна сярод падросткаў.

На гэтыя сродкі будуць арганізаваны вучнёўскія брыгады і вытворчыя майстэрні для беспрацоўнай моладзі.

* * *

Адпушчана 2½ тысячы рублёў на арганізацыю вытворчых майстэрняў пры Добрускай папяровай фабрыцы.

Майстэрні разьлічаны на 40 чалавек.

Процант броні ня будзе зьніжаны

Наркампрацы БССР разам з Наркамгрошовых спраў выдалі цыркулярнае распараджэньне аб захаваньні маючагася проценту броні падросткаў ва ўстановах, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце.

Абсьледаваньне школ соцвыху.

Наркамат Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі ў бліжайшы час прыступае да абсьледаваньня працы школ соцвыху. Абсьледаваньне будзе праводзіцца пры ўдзеле настаўнікаў і працаўнікоў з месц.

Гэтае мерапрыемства мае на мэце высьвятліць мэтазгоднасьць траты адпушчаемых школам сродкаў, парадак будаўніцтва новых школ, удзел насельніцтва ў гэтым будаўніцтве ды інш.

Знойдзен шкілет касарога.

ЦБ краязнаўства атрымала весткі аб знаходзтве ў Горацкім раёне, Аршанскай акругі шкілету касарога.

Гэтая знаходка мае вялікае значэньне, бо даводзіць існаваньне на абшарах Беларусі ў даўнія ад нас часы жывёл, якія зараз водзяцца толькі ў трапічным клімаце.

ТЫРАЖНЫ ДЗЕНЬ.

1-га сьнежня ў Белдзяржтэатры адбыўся 5-ты тыраж дзяржаўнай выйгрышнай пазыкі 1926 г.

8 гадзін, 30 хвілін раніцы.

У тэатр прышлі рабочыя. Яны ўстанаўліваюць і мантуюць электрарухавікі і трансформатары. У шчыт, які павінен вогненнымі літарамі паказваць лічбы сэрый і нумары облігацый, уключаецца ток. Шчыт гатоў. Правяраецца дынамо. Вывешваюцца апошнія лёзунгі. Тэатр падмятаецца

9 гадзін.

На апошнім паверсе тэатру, у разьдзявальні артыстых пачала працу тыражная камісія. Тут—усе: прадстаўнікі ўлады, Наркамфіну БССР і СССР, дэлегацыі ад профсаюзаў і г. д. Камісія падрыхтоўвае плян тыражнага дню і парадак розыгрышаў. Тым часам унізе, на сцэне, працаўнікі Наркамфіну друкуюць бланкі для запісаў розыгрышаў. Прыходзяць акцябраты і піонэры—яны будуць выцягваць „білецікі шчасьця“. Заля напаўняецца публікай.

10 гадзін 20 хвілін.

Нарком ўнутраных спраў БССР тав. **Сташэўскі** просіць комэнданта аховы памяшканьня зьняць караул з калёс. Прадстаўнікі РСІ зрываюць сургучныя штампы з дзьверак. Тыражная камісія правярае колькасьць білетаў. Закладвае іх у патроны. Публіка запаўняе сцэну. Праверка ўтвараецца ва ўсіх на вачох.

11 гадзін 30 хвілін.

Розыгрыш...

Манцёр уключае рубільнікам ток. Засьвісталі дынамо. Пылам узьняліся патроны ў калёсах. Два павароты. З гордасьцю і пачуцьцём уласнай важнасьці піонэр выцягвае білет.

— Сэрыя 3216—аб'яўляе тав. **Сташэўскі.**

— Сэрыя 3216 — аб'яўляе тав. **Лазоўскі** (РСІ).

— Сэрыя 3216 — аб'яўляе тав. **Абрамсон** (Наркамфін БССР).

Успыхваюць вогненныя літары... У залі ўздохі і шалясьценьне облігацый...

2 гадзіны дню.

Розыгрыш дробных выйгрышаў па 200 і 300 рублёў закончаны. Аб'яўляецца перапынак. Калёсы запячатваюцца. Устанаўліваецца караул. Ходзяць чуткі, што ў залі нехта выйграў. Публіка доўга не разыходзіцца.

Ля касы Дзяржбанку расьце чарга. Облігацыі ў 25 руб. каціруюцца ў 29 р. 80 кап. Да вечара чакаецца яшчэ большае павышэньне. Па вестках Наркамфіну, за тры дні рэалізавана облігацый па Менску на **140 тысяч руб.**

5 гадзін, 30 хвілін.

Урачыстае адчыненьне тыражу. Прывітаньні прадстаўнікоў улады, рабочых, чырвонаармейцаў.

Начальнік валютнага кіраўніцтва Наркамфіну СССР тав. **Тамаркін** вітае рабочых і сялян Беларусі з удалай рэалізацыяй пазыкі індустрыялізацыі. Па ўсяму СССР рэалізавана пазыкі на 221 мільён рублёў замест 200.000.000, як меркавалася. Роля рабочых і сялян Беларусі ў гэтай перамозе немалая.

6 гадзін вечару.

Пачынаецца розыгрыш буйных выйгрышаў. У залі—нэрвовае чаканьне...

Прыходзяць рабочыя з фабрык і заводаў. Тэатр перапоўнены, міліцыя ўжо больш ня пушчае нікога. Гучнагаварыцель ля выхаду перадае нумары облігацый. Дзесьці ў глыбіні залі некаму зрабілася млосна... Крыкі... Нехта памыліўся. Облігацыя ня вышлася з абвешчанай на адну... толькі лічбу.

10 гадзін, 30 хвілін.

Розыгрыш падыходзіць да самага галоўнага.

— **100.000.**

На сцэне зьяўляецца пацігадовы хлапчук **Бора Юштэ.** Ён будзе выцягваць 100.000. Бора ў чаканьні важна ходзіць па сцэне і разглядае публіку. Ка ясо круціцца некалькі раз. Публіка нэрвуе.

Бора выцягвае облігацыю № 4 сэрыі 4401.

Дзесьці ахнулі:

— 100.000!

— Хто «шчасьлівец»?

11 гадзін.

Тав. Тамаркін адказвае на запытаньні. А іх многа. Усё—аб тэхніцы тыражу.

— **Пазыка—верны сродак ашчаднасьці грошай працоўных.**

— **Пазыка ўзмацняе фронт соцыялістычнага будаўніцтва.**

Тыраж скончан. Тэатр пусьцее...

Ал. К.



Таварыства „Автодор“.

Гэтымі днямі ў Менску стварылася ўсебеларускае таварыства садзейніцтва паляпшэньню шляхоў зносін і разьвіцьцю аўто-транспарту — „Автодор“.

Старшынёю таварыства абраны нам. старшыні Саўнаркому БССР тав. **Карклін.** Таварыства мае на мэце прыцягненьне шырокіх працоўных мас да справы паляпшэньня шляхоў і ўкараненьня аўтомобілізму ў мясцовы транспорт.

4200 стыпэндый.

У гэтым годзе ў ВНУ, профшколах, тэхнікумах і іншых навучальных установах Беларусі выдаецца 4200 стыпэндый.

Слухачы Комвузу, рабфакаў, савпартшкол і вышэйшых курсаў грамадзянзнаўства забясьпечаны стыпэндыямі на ўсё 100 проц.

Задушыць шкарлятыну.

Беларускі Пастэраўскі Інстытут зараз праводзіць у акругах БССР шырокую антышкарлятынавую кампанію пры дапамозе спэцыяльных урачэбных атрадаў.



„Леон Куцюр'е“.

(Кіно «Культура»).

Аповесьць вядомага расійскага пісьменьніка Лаўрэнэва,—„Рассказ о простой вещи“ паслужыла падставай для стварэньня гэтага фільму.

Рэчы Лаўрэнева ня ўпяршыню выкарыстоўваюцца кіно. Мы памятаем „Вецер“, „41-шы“. Лаўрэнёў—пісьменьнік грамадзянскай бойкі, у яго творах вельмі яскрава, вельмі захапляючы і орыгінальна малюецца вялікі гістарычны пэрыод. Толькі адзін Лаўрэнёў да гэтых пор дае ўсё новыя і новыя варыяцыі гэтай агульнай тэмы.

„Рассказ о простой вещи» таксама малюе грамадзянскую бойку.

Бальшавіцкі камісар Арлоў пад выглядам францускага падданага хаваецца ў горадзе, які захоплены белымі. Надзвычайна вытрыманы і спрытны, ён з посьпехам праводзіць ролю чудака-чужаземца, выкарыстоўваючы сваё становішча для правядзеньня падпольнай рэволюцыйнай працы.

Аповесьць Лаўрэнёва дакладна перададзена на экран. Усё да адзінага радка. Але перанесьці псыхалёгічныя перажываньні на экран не ўдалося.

Есьць культурная перапрацоўка аповесьці, але фільм вялікага ўражаньня не пакідае. Падругое—не паказваецца агульны фон: грамадзянская бойка. Атрымліваецца ўражаньне нейкай незакончанасьці.

Наогул, цікавая аповесьць на экране шмат губляе.

Пастаўлены фільм добра: віртуозныя здымкі, надзвычайна вытрыманая гульня артыстых, добрая ўвязка кадраў. Аднак, рэжысэр ня здолеў мастацка перакласьці на экран цікавую аповесьць Лаўрэнёва, а гэтым і вызначаецца ўся вартасьць такога фільму.

Мік. Т.

„Чорны канвэрт“.

(Кіно «Пролетары»).

„Стальны чалавек, дзіўная вытрымка, поўная адсутнасьць нэрваў“—вось характарыстыка Гары Піля. Адвечны герой трукавых фільмаў. Ён адзін змагаецца супроць авантурыстаў—профэсара Равэлла, ён змагаецца за прыгожую дачку банкіра Эвэнса... Вакол гэтага—некалькі танных трукаў.

Аднак, трукі тут, як і заўсёды, уступаюць места адвечнаму абмалёўваньню сталёвай вытрыманасьці Гары Піля. Ён з вядбайным выглядам рве акцыі, на якіх праіграў сваю ўсю маёмасьць, з ухмылкай паглядае на бандытаў, зьвязаны імі... Сцэнары дазваляе яму праявіць гэту „сталёвасьць“.

У дадатак да-гэтага—пустата зьместу. Нічога дасьціпнага, самабытнага, хвалюючага. Усё старое, усё прыелася.

І гэта ідзе на працягу двух тыдняў на экране рабочага кіно!..

Нін. А.

Гутаркі урача.

Як апранацца ўзімку.

Як апранацца ўзімку? Укутвацца ці не?

Унутры нас маецца найлепшы „кажух“: гэта наша кроў. Яна—цёплая, і прабягаючы па ўсіх частках цела, саграе яго.

Напэўна шмат хто з нас задаваў сабе пытаньне: чаму на марозе чырвонае скура? Сакрэт просты — пачырваненьне скуры бывае ад узмацненьня прыліву крыві. На холад і небясьпеку замярзаньня організм адказвае тым, што ўзмацнёна гоніць кроў да замярзаемых месцаў. Крываносныя сасуды некалькі пашыраюцца, у іх зьмяшчаецца больш крыві і такім чынам, награваюцца паграждаючыя целу месцы.

Калі мароз надта вялікі, ці чалавек занадта слабы, малакроўны, і гэта падмацаваньне не дапамагае, дык крываносныя сасуды звужаюцца, кроў з іх уходзіць ў глыбіню цела, а скура робіцца белай. Гэта першая адзнака абмаражэньня—пабяленьне.

Як-жа апрануцца ўзімку, каб ня было холадна і не атрымалася абмарожаньня?

Загартаваны чалавек адважна можа хадзіць ў лёгкіх галёшах, а калі суха, дык нават бяз іх; на нагах панчохі альбо шкарпэткі ці анучы. Калі ўжо вельмі холадна, дык можна да іх дадаць газэтную паперу. На целе адна зьмена бялізны, паліто на ваце, у крайнім выпадку можна без яе, але з шчыльнай матэрыі. Пальчатак і кашнэ ня трэба і рукі саграюцца ў кішэні паліто.

Дзеля таго, каб хадзіць у такой вопратцы і не замярзаць, трэба штодзенна абціраціца кватэрнай вадою; на вуліцы трэба рухацца энэргічна, штодзённа гадзіну—другую займацца спортам: канькамі, лыжамі і г. д.

Іншая справа—незагартаваны чалавек. Тут неабходна быць асьцярожным.

Такому чалавеку можна раіць хадзіць толькі ў галёшах, хоць бы ня ў глыбокіх. На нагах патрэбны шарсьцяныя шкарпэткі альбо шарсьцяныя панчохі. Калі няма шарсьцяных, дык у вельмі халоднае надвор'е апранаць дзьве пары папяровых шкарпэтак.

У марозы прыходзіцца апрануць 2 пары ніжняе бялізны, у крайнім выпадку абмежавацца хоць-бы фуфайкай, таму што інакш ня доўга атрымаць плеўрыт ці запаленьне лёгкіх. Паліто трэба шыць на ваце. Шапку—пацяплей.

Адзінае, бяз чаго можна абыйсьціся, гэта пальчаткі і шарф альбо кашнэ. Рукі можна час ад часу грэць у кішэнях. Шыю раніцою трэба мыць халоднай вадой і тут-жа да-суха і да-чырвона яе выціраць.

Малады чалавек павінен сябе загартоўваць, ён павінен карыстацца вадою, абціраючыся да-чырвона. Гэтым ён прывучае сваю нэрвовую сыстэму кіраваць крываноснымі сасудамі скуры. Дзякуючы гэтаму, кожа лепш надзяляцца крывёю і добра ёй саграецца, яна ўстойчыва да марозу і мала яго баіцца. А гэта ўсё, што трэба дзеля таго, каб не замерзнуць і не прастудзіцца.

Яшчэ адна маленькая заўвага: організм, якому прыходзіцца знаходзіцца на холадзе, мае патрэбу ў большай колькасьці харчу. Гэта патрэбна дзеля таго, каб сябе сагрэць, выпрацаваць больш цяпла, а цяпло даюць харчы.

Холад раджае апэтыт. Гэта важна для многіх, якія страдаюць дрэнным апэтытам. Апранаючыся некалькі лягчэй, менш укутваючыся, яны адчуваюць патрэбу зьесьці лішні кавалак хлеба, мяса. Так умераны холад дае штуршок організму і прымушае яго ўзмацніць сваю дзейнасьць.

А гэта вядзе да ўзмацненьня здароўя.

Д-р Г. Я. Брук.

Навука і жыцьцё.

„Прыхільнікі... газавай вайны“.

Грамадзкая думка буржуазных краін у ялякім чынам усё больш і больш падрыхтоўваецца да таго факту, што будучая вайна нямінуча зьяніцца вайною хэмічнай. У Амэрыцы нават стварылася таварыства... „Прыхільнікаў... газавай вайны“.


Гэтыя „гуманныя“ людзі выходзяць з тых разуменьняў, што, бач, з 75 тысяч амэрыканскіх салдат, падпаўшых дзейнасьці газаў, памёрла быццам-бы толькі 1½ проц., у той час, як ад іншых родаў аружжа загінула 25 проц.

А сьляпыя, а калекі, атручаныя газамі? Яны, як відаць, не ўвайшлі ў статыстыку.

Амэрыканскі пункт погляду набывае ўсё больш і больш прыхільнікаў у Эўропе. Яно і зразумела: трэба як небудзь апраўдаць мільярдныя затраты на вытворчасьць удушлівых газаў. Гэнэрал Картлей, начальнік хэмічнай часьці брытанскай арміі, зацьвярджае, што нельга параўнаць „нязначныя вынікі“ газу з якім-бы там ні-было раненьнем.

Пад прыкрыцьцем падобных заяў, імпэрыялістыя ўсіх краін шалёна рыхтуюцца да хэмічнай вайны. Вядома, свае прыгатаваньні яны трымаюць у тайне, але якія колечы весткі прасочваюцца ў друк. У агульным вытворчасьць ваенных газаў адбываецца ў адпаведнасьці з наступнай табліцай: нашы ворагі выробляюць сьлёзатачывыя (параўнаўча бясшкодныя) газы; **удушлівыя**, якія выклікаюць адышку і, на рэшце, **токсычныя** газы, якія атручваюць усякага, хто імі будзе дыхаць. Удушлівыя газы выклікаюць хваробу дыхацельных шляхоў, ацёк лёгкіх і сьмерць. Да іх адносіцца хлёрная окісь вугляроду і яшчэ больш атрутная мяшаніна моцнага сінільнага квасу з хлёрам.

Газы, выклікаючыя адышку, дзейнічаюць непасрэдна на кроў, ня ўчыняюць ніякай болі і мукаў і прыводзяць да сьмерці ад паралічу сэрца. Такая окісь вугляроду—чадны газ. Да ліку атрутных газаў, якія дзейнічаюць на нэрвовыя цэнтры, адносіцца сінільны квас.



Разрыўны газавы снарад.

К шчасьцю, ужываньне гэтых газаў у вайне—дасыць цяжкая рэч.

Як-жа будуць ужывацца газы ў будучай вайне?

Спосаб, упяршыню ўжыты ў 1915 годзе немцамі—пуск газу струменем па ветру, аказваецца ўстарэлым. Балёны з газам, якія трэба даставіць на перадавыя позіцыі, занадта цяжкія, карыстацца імі няручна і, акрамя таго, сваволны вецер можа накіраваць струмень газу зусім ня ў той бок, у які трэба.

Таму зараз панове імпэрыялістыя і іх вучоныя паслугачы працуюць над вынаходжаньнем асобных ядраў, напоўненых газамі. Гэтымі знарадамі заражаюць звычайныя пушкі, і, адна граната, якая разарвецца ў лягеры ворага, можа вынесьці з строю ледзь ня цэлы полк. Гэтыя бомбы дазваляюць стварыць газавую атаку ў любым месцы, незалежна ад напрамку ветра.

Адна з такіх „цацак“ паказана на нашым малюнку. Разьмер яе 75 м.м., снарад начынены мелінітам ці трынітруолам. У момант выбуху, шкляны балён, які знаходзіцца ўнутры гранаты, зьнішчаецца і аслабляе газ, які сьціснут ім пад вельмі моцным даўленьнем.

Новае аб шкодзе курэньня тутуну.

Да ліку многіх неабвяржымых доказаў шкоды курэньня тутуну амэрыканскі профэсар **Рэмінгтон** дадаў яшчэ адно. У курыцельных і жавацельных тутунах ім знойдзена надзвычайна шкодная атрута — **мыш'як.**

Аналіз, праведзены ў сельска гаспадарчым інстытуце Паўночнай Дакоты (П.-А. З. Ш) паказаў, што курыцельныя і жавацельныя тутуні амэрыканскага паходжаньня маюць у сябе ад шасьці дзесяцітысячных (0,00006) да трох тысячных (0.003) проценташ мыш'яку (больш нормы, дазваляемай гігіенай дзеля харчпродуктаў).

Прыкладна, палова тутуну пры курэньні ўцягваецца сумесна з дымам, другая палова са сьлюнай пранікае праз страваход у страўнік. Організм курыльшчыка паволі атручваецца губіцельнай атрутай.

№ 14. Шахматы і шашкі

(Друкуецца па суботах).

Эцюд № 9

Т. Горгіева.



Белыя: Кр c2, Лg7, cf1, пg6... (4)

Чорныя: Кр f8, Лh8, К d5, пп f2, h7... (5)

Белыя выйгрываюць.

Эцюд № 9 (шашэчны)

Д. Шэбедзева

Белыя: D—d8, пп c7, e5, f6... (4)

Чорныя: D—b2, п f8

Выйгрыш.

Алёхін чэмпіён сьвету па шахматах.

Скончылася вялікае ў гісторыі шахматнае спаборніцтва, Матч паміж чэмпіёнам сусьвету да гэтага часу Капабланкам і Алёхіным—лепшым шахматыстым-камбінатарам—скончыўся перамогай Алёхіна. Алёхін—вельмі таленавіты шахматысты. Яго перамогу трэба вітаць, як урачыстасьць творчага камбінацыйнага стылю над мэханічнай, дасканала разьлічанай гульнёй Капабланкі.

Матч адбываўся на працягу 2 з паловай месяцаў. Самая цікавая стадыя гульні пачалася з 11 і 12 партыі матчу, калі баявая тактыка Капабланкі перайшла ў бяз'ініцыятыўнае чаканьне нападак з боку Алёхіна. Апошнюю стаўку Капабланка ставіў не на моц сваёй думкі, а на моц сваіх якасьцяў, (вытрыманасьць). Дзеля гэтага ён імкнуўся зрабіць як мага больш нічыіх і тым самым адцягнуць матч, каб Алёхін згубіў сваю вытрымку і потым перамагчы яго. Але як мы бачым па 21, 32 і 34 партыях, якія выйграў Алёхін, тактыка Капабланкі пацярпела паражэньне. Капабланка страціў назву чэмпіёна сьвету.

Ня гледзячы на перамогу Алёхіна, трэба адзначыць, што багатая орыгінальнымі ідэямі творчасьць Алёхіна ў гэтым спаборніцтве не ўпаўне праявілася. Гэта ня значыць, што стыль Алёхіна ня можа процістаяць стылю бышага чэмпіёна сьвету. Гэта значыць толькі, што з гэтага матчу Алёхін не хацеў стварыць экспэрымэнт у выглядзе барацьбы стыляў, таму, што вынік такой барацьбы для яго самога быў-бы сумніцельным. Ён процівапаставіў Капабланку сваю бліскучую тэхніку, якую перамагчы Капабланку аказалася не па сілах.

Хроніка.

— На 2-х агульна-адукацыйных курсах **А. П. Круталевічам** быў дадзены сэанс адначасовай гульні па шашках з лікам +14—1.

Галоўлітбел № 24867.

Адказныя рэдактары: (А. Бараньнікаў (А. Курцік

1-ая дзяржаўная друкарня.